■ Суайчыннікі

# ВЯЛІКІ АСВЕТНІК

**У Мінску прэзентавалі біяграфію Ігната Дамейкі, напісаную яго праўнучкай.**

Што аб'ядноўвае вулканічны ланцуг гор у Андах, выкапнёвага слімака, род птэразаўраў, фіялкавую кветку ды малую планету? Імя Ігната ДАМЕЙКІ, знакамітага выхадца з Беларусі, філамата, удзельніка паўстання 1830—1831 гадоў, навукоўца-даследчыка, геолага, мінеролага, рэктара Чылійскага ўніверсітэта ды нацыянальнага героя Чылі.

Ураджэнец маёнтка ў вёсцы Мядзвядка стаў вядомым далёка за межамі радзімы: сувязямі з Ігнатам Дамейкам ганарацца Літва, Польшча, Германія, Францыя і, нарэшце, Чылі. Менавіта ў Чылі ён здолеў цалкам рэалізаваць свае здольнасці: рэарганізаваў сістэму адукацыі краіны, стварыў музей мінералогіі, адкрыў раней невядомыя мінералы, акамянеласці і расліны, знайшоў у гарах крыніцы чыстай вады, правёў водаправод у Сант'яга... Нездарма на адной з вуліц у сталіцы Чылі ў яго гонар усталяваны помнік «Грандэ Эдукадор» — «Вялікі асветнік».

Яго ўнёсак у сусветную культуру настолькі вялікі, што ў сувязі з 200-годдзем з дня нараджэння знакамітага ўраджэнца Беларусі ЮНЕСКА назвала 2002 год «Годам Ігната Дамейкі». Сёлета святкуюць 215-годдзе з дня яго нараджэння, і Беларусь не засталася ўбаку ад урачыстасцяў.


Фота БЕЛТА.
Пас ДАМЕЙКА падчас прэзентацыі кнігі.

— Беларуская зямля дала свету шмат выдатных паэтаў і пісьменнікаў, мастакоў і кампазітараў, палітыкаў і навукоўцаў. Хай нават і не для ўсіх відавочна, што менавіта тут, на Беларусі, знаходзіцца іх радзіма, — кажа **міністр замежных спраў Уладзімір МАКЕЙ**. — Дзякуючы такім людзям, як Дамейка, быў закладзены падмурак нашай нацыянальнай ідэнтычнасці, стала магчымым фарміраванне беларускай нацыі ў канцы XIX — пачатку XX стагоддзя. Ігнат Дамейка, выдатны навуковец, праславіў Беларусь сваім талентам, адданасцю навуцы і надзвычай шырокай сферай навуковых інтарэсаў і дасягненняў.

На гадавіну з дня нараджэння Дамейкі ў Міністэрства замежных спраў прыехалі нашчадкі дона Ігната (менавіта так называлі чылійцы свайго асветніка) з Аўстраліі, ЗША і Чылі. **Праўнучка вялікага даследчыка, спадарыня Пас ДАМЕЙКА**, з'яўляецца аўтарам біяграфіі знакамітага продка. Падчас урачыстай цырымоніі прэзентавалі пераклад біяграфіі на беларускую мову — кнігу «Ігнат Дамейка: з Мядзвядкі — у Сант'яга-дэ-Чылі». Беларускі пераклад выйшаў па ініцыятыве Міністэрства замежных спраў і пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі.

— Я трымаю ў руках свежую кнігу, якая зрабіла гонар нацыянальнаму кнігавыданню, — сведчыць **міністр інфармацыі Беларусі Лілія АНАНІЧ**. — У сваім змесце яна нясе галоўнае — любоў да нашай краіны, да Беларусі.

Лілія Ананіч папрасіла нашчадкаў Ігната Дамейкі пакінуць свае аўтографы ды колькі слоў пра Беларусь на старонках асобніка «Ігнат Дамейка: з Мядзвядкі — у Сант'яга-дэ-Чылі», які будзе захоўвацца ў Нацыянальнай бібліятэцы. Пас Дамейка была вельмі ўдзячная беларусам за запрашэнне на святкаванне гадавіны свайго прадзеда: «Ніколі ў сваім жыцці я нават не марыла аказацца на Беларусі, зямлі майго продка. Я веру, што ён зараз знаходзіцца паміж намі, усхваляваны і шчаслівы, таму што кніга аб яго жыцці перакладзена на мову яго радзімы».

**Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ**

**Неспрыяльныя дні і гадзіны ў жніўні**

| | | |
|---|---|---|
| 3, чацвер, 23.30 – 24.00 | 11, пятніца, 0.00 – 7.30 | 21, панядзелак, 20.30 – 23.00 |
| 6, нядзеля, 1.30 – 14.30 | 13 нядзеля, 10.00 – 12.30 | 23, серада, 22.00 – 24.00 |
| 8, аўторак, 21.00 – 23.00 | 15, аўторак, 3.00 – 16.00 | 24, чацвер, 0.00 – 3.00 |
| 10, чацвер, 16.00 – 24.00 | 17, чацвер, 15.30 – 19.00 | 26, субота, 7.30 – 11.00 |
| | 19, субота, 17.30 – 20.00 | 28, панядзелак, 11.30 – 21.00 |


Управления принудительного исполнения
главного управления юстиции Витебского облисполкома
объявляет о проведении торгов по продаже имущества,
принадлежащего ОАО «Тираспольская ПМК» (УНП 300125146)

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | Лот №1 Автомобиль MERCEDES-BENZ SPRINTER 312D, 1997 г. в., рег. №АА 3092-2, начальная цена 5 467,00 рублей;<br>Лот №2 Автомобиль ТОЙОТА КЭМРИ, 2007 г. в., рег. №4400 АТ-2, начальная цена 9 346,00 рублей;<br>Лот №3 Автомобиль ГАЗ-66, 1987 г. в., рег. №АА 1865-2, начальная цена 3523,00 рублей;<br>Лот №4 Автомобиль ГАЗ-66, г. в. не установлен, рег. №АА 5347-2, начальная цена 2 753,00 рублей;<br>Лот №5 Автомобиль ЛАДА 21214-120-40, 2013 г. в., рег. №1220 ЕК-2, начальная цена 5 318,00 рублей;<br>Лот №6 Автомобиль ЛАДА ЛАРГУС, 2014 г. в., рег. №AI 9835-2, начальная цена 8 163,00 рублей;<br>Лот №7 Автомобиль УАЗ-ЗЗ 163, 2012 г. в., рег. №0891 ЕI-2, начальная цена 6 532,00 рублей;<br>Лот №8 Станок вертикально-фрезерный 676, инв. №400-853, начальная цена 1 860,00 рублей;<br>Лот №9 Автоподъемник стационарный 2-стоечный 4120А-4Т, 2011 г. в., инв. №400-853, начальная цена 684,00 рублей;<br>Лот №10 Станок радиально-сверлильный, инв. №400-122, начальная цена 2 619,00 рублей;<br>Лот №11 Станок токарный ТВ320, инв. №400-853, начальная цена 993,00 рублей;<br>Лот №12 Станок токарный универсальный 1М63, инв. №400-160, начальная цена 5 870,00 рублей;<br>Лот №13 Трактор БЕЛАРУС-892, 2013 г. в., рег. №7903 ВВ, начальная цена 1 1 624,00 рублей;<br>Лот №14 Экскаватор-погрузчик ДЭМ-1143, 2013 г. в., рег. №7902 ВВ, начальная цена 17 020,00 рублей;<br>Лот №15 Экскаватор-погрузчик ЭП-2620, 2008 г. в., рег. №ВА-2 6555, начальная цена 8 049,00 рублей. |
| Наличие обременений | отсутствуют |
| Местонахождение имущества | г. Витебск, ул. Транспортная, 11<br>и г. Глубокое, ул. Дзержинского, 7а. |
| Место, дата и время проведения торгов | 22.08.2017 г. в 12.00<br>г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.3 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Управление принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома (г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, www.vitebskjust.gov.by)<br>Судебный исполнитель – Ткаченко Сергей Владимирович, тел./факс. (80212) 610421, (8033) 6879148. |
| Условия и порядок проведения торгов | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет управления принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома IBAN BY73AKBB36429030010372000000 в ф-ле 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», BIC AKBBBY21200, УНП 300002505, не позднее 15.00 21.08.2017 г.<br>Величина первого шага составляет 5 процентов от начальной стоимости выставленного на торги имущества (лота).<br>В соответствии со статьей 97 Закона Республики Беларусь «Об исполнительном производстве» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги (покупателем). |


# РЫЦАРЫ НЕБА ПРЫЗЯМЛІЛІСЯ Ў МІНСКУ

## Байцы сіл спецыяльных аперацый адзначылі свае свята



**Побач з Палацам спорту купкамі збіраюцца людзі. Напярэдадні «прафесійнага свята» хлопцы ў паласатых цяльняшках і блакітных берэтах дэманструюць, з чым працуюць ваеннаслужачыя сіл спецыяльных аперацый і якім чынам ідзе падрыхтоўка будучага «рыцара неба». Сапраўды, як сярэднявечных рыцараў можна лічыць элітай войска мінулай эпохі, так і сучасны дэсантнік робіць тое, што не пад сілу іншым байцам. Нездарма іх дэвіз — «Ніхто, акрамя нас!»**

### «ВОЛАТ» І «ЛЯСУН» У ГОРАДЗЕ

Святочнае мерапрыемства на беразе Свіслачы доўжылася ўвесь дзень. Кожны з гасцей знаходзіў занятак і відовішча на свой густ. Адны выпрабоўвалі ўласную стойкасць падчас спартыўных конкурсаў з адцісканнем, падцягваннем, зборкай аўтамата. Дзяўчаты мелі шанц паказаць сябе ў конкурсе «Міс Дэсантура — 2017». Праўда, гэтым разам без дэфіле. Хлапчукі з цікаўнасцю слухалі пра ўзоры баявой зброі і тэхнікі, бо пабачыць і нават памацаць дазвалялася не толькі сучаснае ўзбраенне, але і мадэлі, якія выкарыстоўваліся, напрыклад, у 1930-х гадах. Байцы дазвалялі прымерыць экіпіроўку, пакарыстацца прыборамі разведкі, пасядзець у кабіне баявой машыны «Волат» — яна, дарэчы, упершыню ўдзельнічала ў сёлетнім парадзе на Дзень Незалежнасці.

### З НЕБА — ПРАЗ АГОНЬ

Упрыгожыў мерапрыемства вальс БТР. У ваенных дзеяннях гэта вялізная машына вагою ў 13 тон прызначана для транспарціроўкі падраздзяленняў і іх агнявой падтрымкі пры вядзенні бою. Баявы разлік адзінкі ваеннай тэхнікі — 10 чалавек. Хуткасць машыны, узброенай двума кулямётамі, на зямлі складае 80 кіламетраў у гадзіну, пры гэтым тэхніка ўмела перамяшчацца і па воднай прасторы, пераадольвае роў у два метры шырынёй і ўзбіраецца на паўметровую сценку.


Фота БЕЛТА.



На адміністрацыйным будынку, які размешчаны насупраць пляцоўкі для гледачоў, ледзь бачныя чалавечыя фігуркі. Гэта ваеннаслужачыя сіл спецыяльных аперацый дэманструюць выкананне практычных дзеянняў з выкарыстаннем альпінісцкай амуніцыі. Выкананне заданняў на вышыні патрабуе высокага майстэрства, дакладных дзеянняў і дасканалай падрыхтоўкі. Нярэдка такія элементы салдаты выконваюць уніз галавой, пры гэтым яны павінны быць патэнцыяльна гатовымі весці баявыя дзеянні з магчымым праціўнікам, які засеў унутры будынка.


Фота Рагнеды ЮРГЕЛЬ.

У свяце ўдзельнічаюць і выхаванцы ваенна-патрыятычнага цэнтра падрыхтоўкі дапрызыўнай моладзі «Скіф», які больш як 20 гадоў дзейнічае ў Рэчыцы. Выхаванцы цэнтра, многім з якіх няма і 18 гадоў, вывучаюць змяшаныя адзінаборствы, вадалазную, агнявую, медыцынскую, інжынерную падрыхтоўкі і альпінізм. Сёння маладое пакаленне дэсантнікаў дэманструе элементы спартыўнай акрабатыкі, рукапашнага бою са зброяй і без, спосабы эвакуацыі параненых, прыёмы тактычных дзеянняў на полі бою.

Спецназавец — гэта ваенны прафесіянал, які валодае адразу некалькімі навыкамі і здольны вытрымліваць вялізныя фізічныя і псіхічныя нагрузкі, таму баявая падрыхтоўка — заўсёды на першым месцы. На дэманстрацыі яе элементаў ваеннаслужачымі 5-й асобнай брыгады спецыяльнага прызначэння не абышлося і без найбольш знакамітага відовішча: воіны-дэсантнікі лёгка разбівалі галавой цагліны. А яшчэ з лёгкасцю рассякалі шабляй кавун, які ляжаў на целе іншага чалавека, пры гэтым нікога не параніўшы. Самі ж вайскоўцы ўладкоўваліся спінаю на цвіках з дадатковай нагрузкай зверху. Пасля такога пачынаеш верыць, што гэтыя людзі, якія перамаглі ўласны страх, не дазволяць яго адчуць нам, мірным жыхарам.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.**
*yurgel@zviazda.by*
**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

**У тэму**

**Камандуючы сіламі спецыяльных аперацый Узброеных Сіл Беларусі генерал-маёр Вадзім ДЗЕНІСЕНКА:**

— Сёння сілы спецыяльных аперацый як род войскаў найбольш актыўна развіваюцца ва Узброеных Сілах Беларусі. У сувязі з прымяненнем новых формаў і з улікам таго, што на ўзбраенне трапляе новая тэхніка, вучэнняў у сіл спецыяльных аперацый стала больш. Асноўны ўпор падчас баявой падрыхтоўкі мы робім на начныя дзеянні. У прыватнасці, сёлета адрадзілі здзяйсненне скачкоў з парашутам з самалёта Іл-76 у начных умовах. Акрамя таго, актыўна адпрацоўваем пытанні дэсантавання на ваду.